Фотарэпартаж

**21 жніўня, у перадапошнюю нядзелю вакацый, Лучайская святыня сабрала пад свае скляпенні школьнікаў, студэнтаў, настаўнікаў, бацькоў, каб з Божым бласлаўленнем і малітвай распачаць новы навучальны год.**



Перад святой Імшой выстраілася чарга да канфесіяналу, ачысціць свае душы імкнуліся многія прысутныя. Нядзельнае казанне ксёндз пробашч Мікалай Ліпскі прысвяціў тэме пазнання, ведаў у жыцці кожнага чалавека. Святар зазначыў, што "праз пазнанне праслаўляем Пана Бога". Казнадзей падкрэсліў, што сям'я – першая школа, якая з'яўляецца пачаткам і крыніцай нашага пазнання. Ксёндз працытаваў словы святога Яна Паўла II, што “Вера і розум – як два крылы, на якіх дух чалавечы ўзносіцца да сузірання праўды”.

Падчас працэсіі з дарамі парафіяльная моладзь несла прызы-кубкі, якія атрымала на дыяцэзіяльнай Парафіядзе. Лучайская моладзь дастойна прадставіла парафію ў некалькіх намінацыях. Напрыканцы святой Імшы, усе, хто мае дачыненне да школы, да навукі, атрымалі Божае бласлаўленне і цудоўныя сшыткі з беларускім арнаментам.





Святочны канцэрт, які па словах пробашча, стаў першым урокам ў новым навучальным годзе, быў падрыхтаваны Алесем Лосем і Алесяй Сівохінай. Вядомы музыка, этнограф, прадставіў гледачам старажытныя беларускія інстумэнты: дуду, скрыпку, цымбалы, гармонік. Цікава распавёў пра гісторыю ўзнікнення, паходжання кожнага з іх, і лекцыю замацаваў самабытнай ігрой . Розныя кампазіцыі: "Віленскі вальс", "Крэўскі вальс", полька "Завілей", "Ойра" прагучалі ў праграме. Пасля выступу, Алесь Лось падзякаваў ксяндзу Мікалаю за традыцыю, якая ўсталявалася ў Лучаі. Музыка зазначыў, што Лучайскі касцёл адзін з нямногіх, дзе так падтрымліваецца беларуская культура.



[illegible]